У выбарчай камісіі два палітычныя і адзін ад працоўных. Астатнія чыноўнікі ад ГА.

21.07.2015



Такі расклад можна пабачыць, калі пільна прыглядзеца на склад толькі што ўтворанай Савецкай раённай у Гомелі выбарчай камісіі. Доўгатэрміновы назіральнік ад кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" **Леанід Судаленка**, які сёння прысутнічаў на сумесным пасяджэнні прэзідыума гарадскога Савета дэпутатаў і гарвыканкама па фарміраванні пазначанай выбарчай камісіі дае свой аналіз персанальнага складу чальцоў камісіі.

Пад "прыкрыццем" грамадскасці ў камісію патрапілі начальнік аддзела арганізацыйна-кадравай працы адміністрацыі раёну **Алла Андрушчанка**, супрацоўніца адміністрацыі **Валянціна Баева**, па ўсім відаць малады чыноўнік (дадзеных на яго няма) **Сяргей Куцапаленка**, намеснік генеральнага дырэктара РУП "Гомельаблгаз" **Андрэй Сяргіенка** і галоўны бухгалтар адміністрацыі раёну **Наталля Сачыловіч**.

У якасці прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў – прадстаўніка праўладнай раённай арганізацыі саюза жанчын у раённую выбарчую камісію трапіла намеснік главы адміністрацыі раёну **Алена Герашчанка**, ад раённай праўладнай арганізацыі "Чырвонага Крыжа" старшыня **Таццяна Макарава**, ад раённай праўладнай БРСМ першы сакратар **Вольга Арцемчук**, ад раённага праўладнага аб'яднання ветэранаў старшыня **Алефціна Свірыдава**, ад раённай праўладнай арганізацыі прафсаюза адукацыі і навукі **Наталля Шапарава**.

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2021

СВАБОДА СХОДАЎ

Тры гады "хатняй хіміі" — за знаходжанне на праспекце і парушэнне працы "Мінсктранса"

Дзяржабвінавачанне запрасіла два гады калоніі для палітвязня Івана Багдзевіча

Што адбывалася ў судах па адміністрацыйных справах цягам тыдня?

Ці можна трапіць у калонію, калі своечасова не зняў бчб-сняжынкі з акна? Юрыст расказвае пра змены ў Крымінальным кодэксе

СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ



Сястра асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Паўлава: "Яго хутчэй за ўсё расстралялі"

Андрэй Палуда: "Пакуль няма сістэмных зменаў, новыя прысуды і расстрэлы могуць адбыцца ў любы момант"

Вярхоўны суд не задаволіў апеляцыйную скаргу асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Скрундзіка

Асуджаных да смерці братоў Косцевых памілавалі

Прадстаўнікамі праўладных палітычных партый тут зафіксаваны - ад камуністычнай партыі вядучы інжынер па арганізацыі эксплуатацыі і рамонту збудаванняў універсітэту імя Сухога **Ларыса Вайтовіч** і ад раённай арганізацыі партыі працы і справядлівасці **Лідзія Свердлікава.**

Адзіным працоўным калектывам у раёне, вырашыўшым займацца палітыкай з'яўляецца дзіцячы садок №99, які накіраваў у склад камісіі свайго кіраўніка - **Кацярыну Мельнікаву.** Камнентары, як кажуць, тут будуць залішнімі.

Праваабаронца адзначае, што большасць пазначаных асоб і раней уваходзілі ў склад выбарчых камісій. На апошніх мясцовых выбарах 2014 году, напрыклад, намеснік главы адміністрацыі раёну **Алена Герашчанка** "вылучалася" шляхам збору подпісаў грамадзян, зараз "вырашыла" вылучыца ад грамадскага аб'яднання, сябра створанай камісіі **Наталля Шапарава** зараз "прадстаўлена" ад прафсаюзу, у той час як год таму "вылучалася" ад грамадзян.

Гомельская Вясна

ВІДЭА



БЛОГІ



ЛЕАНІД СУДАЛЕНКА

ЯК Я НЕ СТАЎ УДЗЕЛЬНІКАМ НАРОДНАГА "ХУРАЛА" ЦІ ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!



ЛАРЫСА ШЧЫРАКОВА

Як прайшла спецаперацыя ГУБАЗіК па пошуку брудных майткоў у журналісткі ці кароткая гісторыя аднага ператрусу

НАВІНЫ ПАРТНЁРАЎ

20.04.2023 Андрэй Горват з'ехаў з Беларусі. Што будзе з палацам у Нароўлі? «Новы час»

07.04.2023 Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе «Вясна»

23.03.2023 Зняў двух п'яных расейскіх вайскоўцаў – трапіў пад пераслед, але здолеў збегчы радыё «Свабода»

07.03.2023 Ксенія Луцкіна перахварэла ў калоніі на двухбаковую пнеўманію «Народная воля»

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў СВЕЦЕ

08.08.2022 Пошта ЗША спыніла адпраўленні ў Беларусь

26.07.2022 «Інфармацыя пра маё затрыманне нават мяне шакавала»: ураджэнца Гомельшчыны ўжо тры месяцы трымаюць у ІЧУ ў Расеі

23.07.2022 У Польшчы знік 18-гадовы хлопец з Калінкавічаў

14.07.2022 У Кіеве заявілі аб імавернасці ўзброеных правакацый у памежных з Украінай раёнах Гомельшчыны і Берасцейшчыны

САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ



ПАРТНЁРЫ

Праваабарончыя сайты: Брэст Віцебск Гародня Магілёў

© 2023 Гомельская вясна

stryzhakandrej@gmail.com | sutiajnik@gmail.com